# БЕЛАРУСКАЯ - САМАЯ МАЯ!

*ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТОК №5*

*Студзень пагодны — будзе год плодны.*

Ведаеш, чым адметная беларуская мова? Мы падабраў 10 цікавых фактаў пра роднае слова. Паўтарай вядомае і даведвайся новае разам з намі.

**Дыялектная мова багацейшая за літаратурную**

Слоўнік літаратурнай беларускай мовы налічвае прыкладна 250 000—500 000 слоў. У дыялектнай мове (агульная назва для гаворак людзей у пэўным рэгіёне) — каля 1,5−2 мільёны слоў.

**У беларускай мове тры алфавіты (графічныя сістэмы)**

На сённяшні дзень афіцыйна ўжываецца **кірылічны алфавіт**, які існуе з XIV ст. У XVI ст. з’явілася лацінка. Ёй пісаліся творы беларускай літаратуры XIX ст. На пачатку XX ст. кірылічны і лацінскі алфавіты суіснавалі разам. Так пэўны час газета «Наша ніва» друкавала тэксты на дзвюх графічных сістэмах, каб усе беларусы разумелі напісанае, таму што каталікі звыклі да лацінкі, а праваслаўныя разумелі толькі кірыліцу. Зараз лацінка ўжываецца ў тапаніміцы — назвах геаграфічных аб’ектаў. Таксама ёй карыстаюцца ў побытавых зносінах беларусы, якія лічаць лацінку больш зручнай сістэмай для перадачы асаблівасцяў беларускага маўлення.

З XIV ст. на Беларусі пачалі сяліцца татары, якія трапілі ў палон падчас набегаў Арды. Паступова яны асіміляваліся, і ў выніку з’явіліся кітабы — кнігі, напісаныя па-беларуску **арабскай вяззю**.

**Беларуская мова існуе ў двух правапісах**

У 1918-м годзе мовазнаўца і грамадска-палітычны дзеяч Браніслаў Тарашкевіч выдаў «Беларускую граматыку для школ» кірыліцай і лацінкай. Гэта была першая практычная граматыка. Канешне, былі ў яе і пэўныя недахопы, якія дапрацоўваў у сваёй граматыцы Язэп Лёсік. Распрацаваны ім правапіс называецца класічным, або **«тарашкевіцай»**.

З 1933-га года ў выніку разгортвання русіфікацыі замацавалася так званая **«наркамаўка»**. Гэты правапіс рэфармаваўся двойчы: у 1956-м годзе і ў 2008-м. Апошнім варыянтам мы карыстаемся сёння.

**Ці ведаеш ты, што...**

*Самы светлы талент - дабрата.   (С. Грахоўскі)*

*Помстаю не супакоіць пакуты. Яна зневажае чалавечую годнасць да стану жывёлы...     (Я. Баршчэўскі)*

*Валадарыць светам любоў, самая дасканалая з усіх каштоўнасцей і даброт людскіх, без якой марна ўсё ў свеце.   (Ф. Скарына)*

*Куды б ні завяла цябе далёкая дарога, не забывай ніколі ты бацькоўскага парога.  (П. Броўка)*